# ПРЫВІЛЕІ ВІТАЎТА КЕЙСТУТАВІЧА ЯЎРЭЯМ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА: ПРАБЛЕМА АЎТЭНТЫЧНАСЦІ ДАКУМЕНТАЎ

**З. В. Чэчулін**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*zaharchechulin@gmail.com;*
*нав. кір. – А. М. Латушкін, канд. гіст. нав., дац.*

Навуковы артыкул прысвечаны праблеме аўтэнтычнасці прывілееў Брэсцкім (1388) і Гродзенскім (1389) яўрэям, надаўцам якіх патэнцыйна мог з'яўляцца Вітаўт Кейстутавіч. Каштоўнасць дадзенага наратыва вызначаецца тым, што ў гістарычнай навуцы не было паўнавартасных спроб вывучэння заканадаўчых актаў, выдадзеных этнічным меншасцям у апошняй чвэрці XIV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім (далей – ВКЛ). Аўтар артыкулу даказаў на падставе аналізу гістарыяграфіі і крыніц, што удзельны князь Вітаўт Кейстутавіч не мог выдаць гэтыя заканадаўчыя акты, так як у сувязі з тагачаснай дзяржаўна-палітычнай кан'юнктурай не меў на гэта паўнамоцтваў. Дакументы з'яўляюцца фальсіфікатамі, створанымі ў XVI ст. Артыкул будзе карысным дзеля далейшай распрацоўкі праблематыкі фальсіфікацый дакументаў.

***Ключавыя словы:*** Вітаўт; Вялікае Княства Літоўскае; прывілеі; яўрэі; этнічныя меншасці; фальсіфікат.

У гістарычнай навуцы да сённяшняга моманту склалася ўстойлівае меркаванне адносна існавання дзьвух заканадаўчых актаў, выдадзеных Вітаўтам Кейстутавічам этнічным меншасцям – яўрэйскаму насельніцтву гарадоў Брэста (1388) і Гродна (1389), калі той яшчэ не з'яўляўся манархам усёй дзяржавы. Гэтыя заканадаўчыя акты ўвайшлі ў гістарыяграфію як «прывілеі Вітаўта яўрэям» [1 – 3; 5]. Некаторыя даследчыкі асобна вылучаюць прывілей Вітаўта, які быў выдадзены ўсім яўрэям ВКЛ. Мэта дадзенага артыкула – высветліць, ці існавалі насамрэч арыгінальныя прывілеі. Пачаць трэба з кароткай характарыстыцы гістарыяграфіі, дзеля пазначэння сучаснага стану рэчаў у дачыненні да праблемы вывучэння пазначанай вышэй тэмы.

Значны ўнёсак у навуковае асэнсаванне і разуменне генэзісу яўрэйскіх прававых нормаў у ВКЛ зрабіў С. А. Бяршадскі (1850 – 1896). Так, яго працы атрымалі выйсце ў выглядзе двух зборнікаў дакументаў па гісторыі яўрэяў ВКЛ і цэлай манаграфіі [2]. Пасля С. А. Бяршадскага вывучэннем прававога становішча яўрэеў ВКЛ амаль ніхто не займаўся. Толькі ў 1986 г. познаньскі гісторык Е. Ахманьскі (1933 – 1996) апублікаваў некалькі тэкстаў прывілеяў Вітаўта Кейстутавіча Брэсцкім і Гродзенскім яўрэям [7, s. 168 – 180]. Нягледзячы на тое, што даследчык уключыў усе прывілеі ў раздзел пад назвай «фальсіфікаты», доказаў

адносна сфаліфікаванасці прывілееў прадстаўлена не было [6, s. 168]. Відавочна, што ў межах сваёй працы, якая з'яўляецца зборнікам археаграфічных публікацый, Е. Ахманьскі ставіў перад сабою іншую мэту, таму і не палічыў неабходным аргументаваць свае гіпотэзы адносна сфальсіфікаванасці прывілееў. Асобнае даследванне, якое па сутнасці і структуры таксама з'яўляецца археаграфічным зборнікам дадзеным заканадаўчым актам прысвяціў літоўскі навукоўца Станісловас Лазутка (1923 – 2009) [3]. Вельмі дзіўным з'яўляецца тое, што аўтарытэтны літоўскі навукоўца цалкам паўтарае высновы С. А. Бяршадскага. Вылучыўшы 6 спісаў прывілея 1388 г., даследчык усю ўвагу надаў тэксталагічнай працы.

У межах дадзенага артыкула мы павінны ўсталяваць, ці мусілі быць выдадзены дадзеныя акты права Вітаўтам у 1388 і 1389 гг. Сумнеў адносна аўтэнтычнасці прывілея Вітаўта ўсім яўрэям ВКЛ, датаванага 1388 г. выказваў яшчэ С. А. Бяршадскі. Так, ён прыйшоў да высновы, што Вітаўт не выдаваў прывілей усім яўрэям ВКЛ, а толькі яўрэйскім абшчынам (кагалам) Берасця і Гродна. У дадатак да доказаў С. А. Бяршадскага трэба адзначыць, што ў 1388 – 1389 г. Вітаўт не тытулаваўся вялікім князем літоўскім, адпаведна пад яго юрысдыкцыяй маглі знаходзіцца толькі Гродна і Брэст. [2, с. 187]. Тытулатура Вітаўта, якая ўжываецца у дакуменце (дзедзіч Гарадзенскі, Брэсцкі, Драгічынскі, Луцкі, Уладзімірскі) не дае адказу на тое, яўрэям якіх геаграфічных адзінак дадзеныя прывілеі былі выдадзены [2, с. 207]. Асноўны крыніцавы матэрыял, апрацаваны Бяршадскім – гэта тэксты актавых судовых кніг. У некаторых пазнейшых дакументах XVI – XVII ст. сапраўды ёсць пацверджанні ранейшых наданняў Вітаўта Кейстутавіча.

Канчатковая выснова аўтара – прывілей Вітаўта, датаваны 1388 г. быў выдадзены толькі Берасцейскім габрэям [2, с. 211]. Тое, што прывілей вайшоў ва ўжытак як заканадаўчы акт, выдадзены ад імя вялікага князя літоўскага Вітаўта усім яўрэям ВКЛ, па меркаванню С. Бяршадскага, сведчыць аб тым, што ў копію прывілея, пацверджанага вялікім князем літоўскім Жыгімонтам І у 1507 г. пазней была ўключана інтэрпаляцыя, якая замяняла слова «жидов берестейских» на слова «жидов вышейменованой» [2, с. 215]. У дачыненні да прывілея Брэсцкім яўрэям Бяршадскі выказаў меркаванне адносна запазычаннасці юрыдычных правоў і нормаў Заходней Еўропы, пры тым пасля гэтага навукоўца зрабіў выснову аб тым, што прывілей Вітаўта Гарадзенскім яўрэям паўстаў на глебе Літоўска-рускіх адносін. На жаль, даследчык не патлумачыў, што ён мае на ўвазе пад «Літоўска-рускімі адносінамі», невядома, якія пісьмовыя і юрыдычныя традыцыі мелі месца быць, аўтар працы іх банальна не называе [2, с. 219]. Сваю гіпотэзу С. А. Бяршадскі

нічым не пацвярджае, толькі заўважыў, што калі прывілеі былі выдадзены, то можна меркаваць пра існаванне т. зв. «общин» - кагалаў.

Пачынаючы з С. А. Бяршадскага, даследчыкі эпіганічна сцвярджаюць, што прывілеі Вітаўта вельмі падобныя па структуры і юрыдычных нормах на ўзор т. зв. Калішскага Статута Баляслава 1264 г. Прывілей Брэсцкім яўрэям, датаваны 1 ліпеня 1388 г. мусіў быў напісаны на лацінскай мове [6, s. 151 – 152]. Тэкст захаваўся у складзе 11 кнігі кароннай метрыкі ў выглядзе т. зв. спіса [7, s. 172]. Прывілей, выдадзены Вітаўтам нібыта усім яўрэям ВКЛ таксама датуецца 1 ліпеня 1388 г. тэкст прывілея нібыта часткова увайшоў у пацвярджаючы прывілей Жыгімонта I ад 5 студзеня 1507 г. [7, s. 175].

Заканадаўчы акт, выдадзены гродзенскім яўрэям быў датаваны 18 чэрвеня 1389 г. Апошні, як устанавіў Е. Ахманьскі, быў упісаны ў 120 кнігу метрыкі ВКЛ [7, s. 180]. Калі прывілей брэсцкім яўрэям быў напісаны на лаціне, то прывілей гродзенскім яўрэям мае іншы фармуляр, і напісаны на рускай мове канцылярыі ВКЛ пачатку XVI ст. Атрымліваецца, што рэканструяваць першапачатковы тэкст прывілеяў не магчыма. Аднак, адсутнасць арыгіналаў актаў не з'яўляецца канчатковым аргументам дзеля высновы аб неіснаванні аўтэнтычных дакументаў. Тут справа палягае ў іншым.

Па-першае, у аўтэнтычных гістарычных крыніцах таго часу, якія захаваліся да нашых дзён яўрэі не фіксуюцца як этнічныя групоўкі людзей, ні як асобныя сацыяльныя суб'екты, пражываючыя на тэрыторыі княства. Па-другое, даследчыкі не выкарыстоўвалі аўтэнтычныя, захаваныя да нашага часу гістарычныя крыніцы апошняй чвэрці XIV ст. У дадзеным выпадку тэксталагічныя метады не павінны быць вядучымі, дзеля ўсталявання гістарычнай ісціны. Праца post factum са спісамі дакументаў не з'яўляецца прадуктыўнай, так як варта разумець грамадска-палітычны кантэкст сітуацыі, у якой маглі быць выдадзены дадзеныя акты заканадаўства.

У 1388 – 1389 гг. Вітаўт нават не атрымаў пісьмовага акту, які б рэгламентаваў умовы перадачы Гродзенскай і Брэсцкай зямлі яму ва ўладанне. Гэта пацвярджаецца словамі з хронікі Длугаша, які адлюстроўваў напружаныя адносіны прадстаўнікоў дзьвух розных дынастый напярэдадні Люблінскага з'езду 1389 г. Калі Вітаўт запрасіў пацвердзіць пісьмова яго ўладанні, Ягайла адмовіў яму, абумовіўшы тое тым, што зямлю ён аддаў яму «до воли своей» [4, с. 465].

За перыяд ад 1386 – 1392 гг. мы не ведаем ніводнага заканадаўчага акту, выстаўленых ад імя каго-небудзь з удзельных князёў ВКЛ, якія знаходзіліся ў вассальнай залежнасці ад Уладзіслава II Ягайлы. Апошні з'уляўся для набілітэта ВКЛ найвышэйшым літоўскім князем (supremus

dux). Нават Скіргайла Альгердавіч, які пэўны час з’яўляўся намеснікам Уладзіслава II Ягайлы ў ВКЛ, ад свайго імя не выдаў ніводнага дзяржаўна-прававога акту, так як з’яўляўся толькі намеснікам Ягайлы ў ВКЛ. Такім чынам, выданне дастаткова важкіх заканадаўчых актаў тых часоў было магчыма толькі з санкцыі кіраўніка дзяржавы, якім і з’яўляўся Уладзіслаў II Ягайла. У спісах прывіляў не згадваюцца нават імёны, прозвішчы і пасады тых, каму адрасаваны дакумент. Гэта дастаткова странна, так як кагалы мелі сваю структуру і духоўных лідараў, якія вядомы пад назвай «рабін».

Такім чынам, прывілееў Брэсцкім і Гродзенскім яўрэям у выглядзе заканадаўчых актаў XIV ст. ніколі не існавала. Фальсіфікацыя прывілеяў усім яўрэяў ВКЛ і гродзенскім яўрэям адбылася ў вялікакняжацкай канцылярыі Жыгімонта I не раней за 1507 г. Матывацыя стварэння фальсіфікатаў палягае ў тым, што абгрунтаванне правоў на мясцовае самакіраванне яўрэйскіх кагалаў патрабавала звароту да некаторых традыцый мінулага. Улічваючы намеры прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва атрымаць заканадаўчы акт, які б рэгламентаваў прынцыпы іх пражывання на дадзенай тэрыторыі, Жыгімонт I санкцыянаваў стварэнне пісьмовага дакументу. Вышэйпазначанае сведчыць аб тым, што ў ВКЛ на пачатку XVI ст. у пісьмовай культуры пры стварэнні фальсіфікатаў існавала традыцыя апеляцыі да дасягненняў мінулых манархаў, якія ў асэнсаванні тагачаснага грамадства з’яўляліся узорнымі дзяржаўна-палітычнымі дзеячамі. Гэта і абумовіла стварэнне фальсіфікатаў прывілеяў, аўтарам-надаўцам якіх з’яўляўся нібыта Вітаўт Кейстутавіч, вобраз якога ўжо напачатку XVI ст. быў вядомы шырокім колам грамадства і ўсведамляў сабою перыяд «залатога веку» у ВКЛ. Такім чынам, апеляцыя да аўтарытэтаў адметна адбілася як на пісьмовых, так і на прававых нормах.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Белы А. В. Прывілей Вітаўта яўрэям 1388 / А. В. Белы // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 5: М — Пуд / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш.; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн.: БелЭн, 1999. — С. 579 – 580.
2. Бершадский С. А. Литовские евреи: История их юридического и общественного положения в Литве от Витовта до Люблинской унии: 1388-1569 / С.А. Бершадский. – СПб.: Тип. М.М. Стасюлевича, 1883. – 440 с.
3. Лазутка С., Гудавичюс Э. Привилегия евреям Витаутаса Великого 1388 года / С. Лазутка, Э. Гудавичюс. – М. Иерусалим : Еврейский ун-т, 1993. – 119 с.
4. Лицкевич О. В. «Летописец великих князей литовских» и «Повесть о Подолье»: опыт комплексного критического разбора / О. В. Лицкевич // СПб.: Дмитрий Буланин, 2019. – 928 с., 16 с. [цв. вкл.]
5. Шуман А. Ашкеназскія габрэі як адзін з карэнных народаў беларусі [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: https://news.arche.by/by/page/science/historya-navuka/57. Дата доступа : 02. 04. 2021.

6. Kosman M. Dokumenty wielkiego księcia Witolda / M. Kosman // Studia Źródłoznawcze. – T. 16. – 1971. – S. 139–168.
7. Vitoldiana : Codex privilegiorum Vitoldi Magni ducis Lithuaniae 1386-1430 / zebrał i wydał Jerzy Ochmański. – Warszawa : Państwowe Wydawn. Nauk, 1986. – 255 s.